Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

Институт истории Национальной академии наук Беларуси

# 1917 ГОД В ИСТОРИЧЕСКИХ СУДЬБАХ НАРОДОВ БЕЛАРУСИ

*Материалы Международной научно-теоретической конференции*

*г. Минск, 22 декабря 2017 г.*

Минск
БГПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Т936

Печатается по решению Совета исторического факультета БГПУ

Р е д к о л л е г и я:
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Касович (отв. ред.);*
кандидат исторических наук, доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук, доцент *А. А. Корзюк*

Р е ц е н з е н т ы:
доктор исторических наук, профессор *А. П. Житко;*
доктор исторических наук, профессор *А. М. Лютый*

**1917 год** в исторических судьбах народов Беларуси : материалы
Т936 Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 252 с.
ISBN 978-985-541-414-9.

В сборнике представлены материалы исследований ученых Беларуси, России, Казахстана, Туркменистана, студентов, магистрантов, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные 100-летию Октябрьской революции.
Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-414-9**

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СПРОБА ЎВЯДЗЕННЯ МІРАВЫХ СУДОЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1917 г.

***Гушчынскі І. Г.,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ, г. Мінск*

У перыяд Лютаўскай рэвалюцыі судовая сістэма стала адной са сфер дзяржаўна-прававога ладу Расійскай імперыі, якія ў найменшай ступені падвергліся пераўтварэнням. У свой час судовая рэформа 1864 г. апярэдзіла агульны ход працэсу мадэрнізацыі краіны. Яна грунтавалася на прынцыпах незалежнасці судовай улады, галоснасці і спаборнасці судовага працэсу. Аднак у 1870–80-х гг. самадзяржаўем быў прыняты шэраг мер па іх абмежаванні. Важнейшае значэнне ў дадзеным кантэксце мела скасаванне паводле закона ад 12 ліпеня 1889 г. інстытута міравых суддзяў (на тэрыторыю Беларусі ён быў пастулова распаўсюджаны ў 1900–1903 гг.). У сельскай мясцовасці іх паўнамоцтвы перадаваліся земскім участковым начальнікам, якія ў сваёй асобе сумяшчалі судовыя і адміністрацыйныя функцыі ў адносінах да сялян. Гэта відавочна супярэчыла прынцыпам незалежнасці і ўсесаслоўнасці суда. Часовы ўрад у якасці асновы сваёй палітыкі ў сферы суда абвясціў вяртанне да першапачатковых прынцыпаў Судовых статутаў ад 20 лістапада 1864 г. Адным з галоўных дзеянняў у дадзеным кірунку стала ўзнаўленне дзеяння інстытута міравых суддзяў.

4 мая 1917 г. Часовым урадам была выдадзена Пастанова аб часовым уладкаванні мясцовага суда [1, с. 224–238]. Яна прадугледжвала распаўсюджанне дзеяння закона ад 15 чэрвеня 1912 г., паводле якога ў Расійскай імперыі аднаўляўся інстытут міравых суддзяў на 33 губерні, у якіх ён дагэтуль не быў уведзены (у тым ліку Мінскую, Віцебскую і Магілёўскую). Пры гэтым у пастанове ад 4 мая 1917 г. утрымліваліся важныя адрозненні ад норм дадзенага закона, а таксама Судовых статутаў 1864 г. Для міравых суддзяў не прадугледжваўся маёмасны цэнз. Міравыя суды станавіліся не аднаасобнымі, а калегіяльнымі судовымі органамі: крымінальныя і за пэўнымі выключэннямі грамадзянскія справы павінны былі вырашацца з удзелам двух членаў міравога суда. У гарадах іх вылучалі гарадскія думы, у сельскай мясцовасці – земскія валасныя сходы.

Працэс укаранення інстытута міравых суддзяў у розных губернях адбываўся па-рознаму. У Мінскай губерні ў 1917 г. міравыя суды былі ўведзены толькі ў Барысаўскім павеце [2, арк. 4]. 6 верасня 1917 г. выбраныя міравыя суддзі і міравы з’езд (з’езд міравых суддзяў) Барысаўскага павета прыступілі да выканання абавязкаў і дзейнічалі прынамсі да ўсталявання ўлады бальшавікоў у канцы 1917 г. [3, арк. 22]. У астатніх жа паветах Мінскай губерні працягвалі функцыянаваць часовыя суддзі, якія з вясны 1917 г. выконвалі судовыя абавязкі скасаваных земскіх участковых начальнікаў. Прычым яны ўспрымаліся хутчэй не пераемнікамі земскіх начальнікаў, а выконваючымі абавязкі міравых суддзяў [4, арк. 90].

На большай частцы Віцебскай губерні земскія начальнікі пасля іх скасавання ў сакавіку 1917 г. не былі заменены часовымі суддзямі. Таму неабходнасць хутчэй-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шага ўкаранення міравой юстыцыі тут адчувалася асабліва востра. Адзін з павятовых камісараў губерні 12 мая 1917 г. у тэлеграме на імя губернскага камісара А. Валковіча паведамляў, што неадкладнае ўвядзенне суда з'яўлялася адным з самых важных пытанняў бягучага моманту [5, арк. 192]. У сваю чаргу, сам губернскі камісар патрабаваў ад павятовых камісараў як мага хутчэй прыступіць да выбараў міравых суддзяў [5, арк. 103]. У чэрвені – ліпені яны былі выбраныя ва ўсіх паветах Віцебскай губерні, акрамя Себежскага [6, арк. 38–46]. Аднак пасля гэтага не ўсе з іх адразу прыступілі да выканання абавязкаў. У некаторых выпадках сур'ёзнай перашкодай для гэтага стала першапачаткова немагчымасць рэалізацыі калегіяльнага характару міравых судоў. Справа ў тым, што членаў міравога суда ў сельскай мясцовасці павінны былі вылучаць валасныя земствы. Аднак яны пачалі тут фарміравацца толькі ў канцы лета. Часовы ўрад у такіх выпадках дазваляў міравым суддзям дзейнічаць аднаасобна. Але на практыцы гэта часта станавілася немагчымым з-за недаверу насельніцтва да аднаасобнай формы правасуддзя. У сувязі з гэтым у Лепельскім павеце члены міравога суда былі выбраныя валаснымі камітэтамі, г. зн. не чакаючы стварэння валасных земстваў [7, арк. 6 адв.]. Такім чынам, на большай частцы Віцебскай губерні вясной – летам 1917 г. мела месца сітуацыя, калі на працягу 3–4-х месяцаў фактычна не было мясцовых судовых органаў, прынамсі ў сельскай мясцовасці. Тым часам масавы характар набылі такія злачынствы, як захопы сялянамі памешчыцкай зямлі, самавольныя парубкі лесу, пакосы сена і інш. [5, арк. 12, 13, 17, 19, 20, 58 і інш.]. Падтрыманне парадку ў адсутнасці судоў ніжэйшага звяна ў такіх абставінах было практычна немагчымым. Таму мясцовыя органы ўлады рабілі намаганні, каб выбраныя міравыя суддзі хутчэй пачалі функцыянаваць. Так, 26 ліпеня намеснік Віцебскага губернскага камісара В. Бомас прадпісваў начальніку міліцыі Гарадоцкага павета садзейнічаць таму, каб міравыя суды неадкладна прыступілі да працы, пры гэтым дадаваў: «Во всех случаях хулиганства, насилия, самоуправства привлекайте к законной ответственности… с немедленным предъявлением обвинения в надлежащем суде» [5, арк. 157].

Да пачатку жніўня 1917 г. у Віцебскай губерні міравыя суддзі пакуль не дзейнічалі толькі ў Полацкім, Дзвінскім, Лепельскім і Себежскім паветах [6, арк. 40, 42, 45]. Але ў першай палове жніўня ў першых трох з іх міравыя суды ўжо функцыянавалі [6, арк. 38–46]. У Себежскім жа павеце было прынята рашэнне пачакаць стварэння новага павятовага земства і да той пары выбары міравых суддзяў не праводзіць [6, арк. 47].

Выбраныя ў Віцебскай губерні міравыя суддзі ў сваёй большасці мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю. Як правіла, у іх ужо быў досвед працы ў сферы суда – у якасці гарадскіх суддзяў, адвакатаў, сакратароў павятовых з'ездаў (павятовыя з'езды да рэвалюцыі выконвалі функцыю суда 2-й інстанцыі для земскіх начальнікаў і гарадскіх суддзяў). Разам з тым, у Лепельскім і Гарадоцкім паветах сярод выбраных міравых суддзяў аказалася некалькі былых валасных пісараў, якія не мелі нават сярэдняй адукацыі. Згодна тлумачэнню міністра юстыцыі ім было прадпісана пакуль на пасаду

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

не ўступаць. Першапачаткова вакантнымі застаўся шэраг міравых участкаў і ў Дзвінскім павеце – па прычыне недахопу кандыдатур. Акрамя таго, у некаторых выпадках выбраныя міравыя суддзі знаходзіліся на дзейснай вайсковай службе, адпаведна, таксама адразу прыступіць да працы не маглі. У такіх сітуацыях абавязкі міравых суддзяў вакантных участкаў размяркоўваліся паміж іншымі міравымі суддзямі [7, арк. 7].

Міравыя суддзі былі выбраныя і ў Магілёўскай губерні. Прынамсі ў верасні 1917 г. яны прыступілі да працы. Гэта бачна з апублікаваных у «Могилёвских губернских ведомостях» прыказаў аб прызначэнні сакратароў з’ездаў міравых суддзяў і абвестак аб выкліку міравымі суддзямі спадчыннікаў [8].

Паводле ўжо згаданай пастановы Часовага ўрада ад 4 мая 1917 г. аб уладкаванні мясцовага суда спынялі сваё існаванне валасныя суды, якія ўваходзілі ў структуру сістэмы сялянскага самакіравання. Справы, раней падсудныя валасным судам, пераходзілі ў кампетэнцыю міравых судоў. Адпаведна, у паветах прадугледжвалася павелічэнне колькасці міравых участкаў у параўнанні з лічбай земскіх начальнікаў. Але да моманту пачатку непасрэднай працы выбраных міравых судоў валасныя суды павінны былі працягваць дзейнічаць. Аднак у шматлікіх выпадках яны ліквідаваліся яшчэ ў сакавіку – красавіку 1917 г. разам са скасаваннем валасных праўленняў [7, арк. 5]. Па словах Віцебскага губернскага камісара А. Валковіча, адносіны насельніцтва да валасных судоў былі рэзка негатыўнымі [7, арк. 5].

Такім чынам, Часовы ўрад удзяляў значную ўвагу аднаўленню і развіццю інстытута выбарнага міравога суда. Гэта адпавядала ідэі дэмакратызацыі правасуддзя. Аднак на тэрыторыі Беларусі ва ўмовах палітычнай нявызначанасці і прыфрантавой абстаноўкі да канца кастрычніка 1917 г. інстытут міравой юстыцыі ў поўнай ступені так і не быў укаранены.

***Літаратура***


1. Сборник указов и постановлений Временного правительства. Выпуск № 1. 27 февраля – 5 мая 1917 г. / сост. Отд-нием Свода законов Гос. канцелярии. – Петроград : Гос. канцелярия, 1917. – VI, 2, 555 с.
2. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 554.
3. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 3.
4. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1685. Воп. 4. Спр. 1.
5. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 33.
6. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 37.
7. Нацыянальны гістарычы архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 3445. Воп. 1. Спр. 63.
8. Могилевские губернские ведомости. – 1917. – № 37–49.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ